WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ВЕРАСНЯ 2011 г. ПЯТНІЦА № 172 (27036)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## У суботу невялікі дождж, а цудоўнае надвор'е — у нядзелю

**Яшчэ сёння тэрыторыя Беларусі застанецца пад уплывам вільготных і халаднаватых паветраных мас з Балтыйскага мора. Таму будзе ісці кароткачасовы дождж, месцамі навальніца. Тэмпература ўдзень 13—19 градусаў, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

На выхадныя надвор'е палепшыцца. Аднак у суботу будзе яшчэ ветрана, а на паўночным усходзе пройдзе кароткачасовы дождж, магчымая навальніца. Тэмпература ўначы на суботу 6—11, удзень — ад 14 цяпла на поўначы да 20 на поўдні краіны. А вось у нядзелю Беларусь трапіць у зону павышанага ціску. Будзе малавоблачна і без ападкаў. Тэмпература ўначы 5—11, удзень — 17—23, на паўднёвым захадзе — да 25 цяпла. У сталіцы на Дзень горада будзе яшчэ ветрана і магчымы невялікі дождж. Тэмпература ўдзень 16—18.

У пачатку наступнага тыдня захаваецца ўмераная цеплыня. У панядзелак уначы 6—11, на захадзе да 11 градусаў, удзень — ад 18 на паўночным захадзе да 25 цяпла на паўднёвым усходзе. Аднак потым атмасферны ціск пачне падаць, таму месцамі чакаюцца дажджы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ПРАВЕСЦІ МІЖНАРОДНЫ ФОРУМ ПА ПАРТНЁРСТВЕ ДЗЯРЖАВЫ І СПАРТЫЎНАЙ ГРАМАДСКАСЦІ

**Беларусь гатова правесці ў сябе буйны міжнародны форум, галоўнай тэмай якога стала б супрацоўніцтва дзяржавы і спартыўнай грамадскасці. Аб гэтым заявіў 8 верасня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з удзельнікамі пасяджэння выканкама Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў (ЕАК).**

Для ўдзелу ў пасяджэнні ў Мінск прыбылі кіраўнікі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў 13 краін, а таксама шэраг іншых высокапастаўленых замежных дзеячаў сферы спорту.

Перад пачаткам форуму ўсе прысутныя ўшанавалі мінутай маўчання памяць загінулых у авіякатастрофе ў Яраслаўскай вобласці членаў расійскага хакейнага клуба «Лакаматыў». «На жаль, спартыўны свет панёс учора незаменную страту, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта нашы родныя браты, і мы смуткуем аб ахвярах гэтай трагедыі, сярод якіх былі і беларусы — выдатныя майстры вялікай гульні».

Звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння, Прэзідэнт адзначыў, што для Беларусі іх прыезд не толькі вялікі гонар, але і знак міжнароднага прызнання ўкладу нашай краіны ў развіццё лепшых традыцый еўрапейскага і сусветнага спорту. Ён падкрэсліў, што Беларусь будзе дзейнічаць у гэтым ключы і далей.

«У сучаснай Беларусі, я лічу, у гэтым паспелі пераканацца, пануе сапраўдны культ здароўя і фізічнай дасканаласці, якія ўваходзяць у лік галоўных прыярытэтаў нашай дзяржаўнай палітыкі. Заняткі фізкультурай і спортам у нас не для выбраных, а масавая, сапраўды народная справа, якая з'яўляецца даступнай і заахвочваецца дзяржавай», — сказаў Прэзідэнт. «Праз 5 гадоў сярод асоб, якія займаюцца спортам, будзе чвэрць нашага насельніцтва. Беларусаў па праве называюць спартыўнай нацыяй, і мы для гэтага робім усё і ў далейшым будзем рабіць».

«Ва ўсе часы наш народ славіўся сілай, упартасцю і мужнасцю — тымі якасцямі, якія абазначаюцца ёмістым паняццем «спартыўны характар», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што развіццю алімпійскага руху і спорту высокіх дасягненняў у Беларусі ўдзяляецца асаблівая ўвага. Паводле яго слоў, будучых чэмпіёнаў у краіне гадуюць з юных гадоў. Функцыянуюць 430 дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ і 12 вучылішчаў алімпійскага рэзерву. У 38 цэнтрах алімпійскай падрыхтоўкі адточваюць сваё майстэрства прадстаўнікі 49 нацыянальных каманд. У скарбонцы суверэннай Беларусі — 14 залатых, 28 сярэбраных і 48 бронзавых алімпійскіх медалёў. Прэзідэнт адзначыў, што за 20 гадоў незалежнасці ў краіне пабудавана спартыўных збудаванняў больш, чым за ўвесь перыяд знаходжання ў складзе СССР. Толькі за два апошнія алімпійскія цыклы ўведзены ў эксплуатацыю звыш 50 аб'ектаў сусветнага ўзроўню.

Беларусь неаднаразова станавілася месцам правядзення самых прэстыжных міжнародных спаборніцтваў і заваявала права прыняць у сябе чэмпіянат свету па хакеі 2014 года.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь будзе змагацца за права стаць першай краінай-гаспадыняй новых спаборніцтваў — Еўрапейскіх гульняў. І калі нашай краіне будзе дазволена першай прыняць такі прадстаўнічы спартыўны форум, то ён будзе праведзены на самым высокім узроўні.

«Мы ўсёй душой падтрымліваем ініцыятыву Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў па арганізацыі з 2015 года новых комплексных спаборніцтваў — Еўрапейскіх гульняў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў таксама разгледзець магчымасць сумеснага правядзення гэтых гульняў некалькімі дзяржавамі. «Рэалізацыя такога праекта паслужыць далейшаму збліжэнню нашых народаў», — упэўнены кіраўнік беларускай дзяржавы.

Гаворачы аб падтрымцы алімпійскага руху, Аляксандр Лукашэнка закрануў яшчэ адно актуальнае пытанне — аб узаемадзеянні органаў улады і нацыянальных алімпійскіх камітэтаў. Паводле яго слоў, гэта тэма ўзнімалася ўжо не раз і ў наступным годзе стане асноўнай на Генасамблеі Асацыяцыі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў.

На думку Прэзідэнта, Беларусь у гэтым напрамку можа служыць прыкладам канструктыўнага супрацоўніцтва дзяржавы і спартыўнай грамадскасці. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што кіраўнікамі беларускіх спартыўных асацыяцый у большасці з'яўляюцца члены ўрада, людзі з вялікім адміністрацыйным рэсурсам, здольныя вырашаць для спорту многія пытанні. На думку кіраўніка дзяржавы, гэта дае свой станоўчы эфект.

У выпадку, калі ЕАК зацікавіць такі вопыт і яны гатовы пераканацца ў эфектыўнасці такога дзяржаўна-грамадскага партнёрства, Беларусь гатова правесці ў зручны для іх тэрмін міжнародны форум, канферэнцыю і абмеркаваць гэту тэму і іншыя пытанні.

Аляксандр Лукашэнка запрасіў удзельнікаў пасяджэння наведаць спартыўныя аб'екты краіны, паразмаўляць са спартсменамі і трэнерамі без пратакола, пахадзіць па вуліцах Мінска, іншых гарадоў, вёсак, паразмаўляць з людзьмі. «Я хачу, каб вы паехалі з Беларусі, убачыўшы сапраўдны твар беларускага народа і нашай дзяржавы, — сказаў беларускі лідар. — Мы заўсёды рады гасцям, якія да нас прыходзяць з адкрытым сэрцам».

Прэзідэнт запрасіў прысутных да абмеркавання найбольш злабадзённых пытанняў еўрапейскага спартыўнага руху.

Высокую ацэнку ўзаемадзеянню беларускай дзяржавы з Нацыянальным алімпійскім камітэтам і спартыўнымі арганізацыямі, вопыт якога трэба пераймаць, даў прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў (ЕАК), прэзідэнт НАК Ірландыі Патрык Хікі.

Паводле яго слоў, беларускія спартсмены займаюць дастойныя месцы і атрымліваюць шмат медалёў на міжнародных спаборніцтвах, што з'яўляецца сведчаннем вялікіх укладанняў дзяржавы ў спорт. «Мы разглядаем гэта як добрыя інвестыцыі з боку Беларусі», — падкрэсліў Патрык Хікі.

Ён адзначыў важнасць таго, што ў Беларусі Нацыянальны алімпійскі камітэт узначальвае Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік ЕАК таксама даў пазітыўную ацэнку рабоце генеральнага сакратара беларускага Нацыянальнага алімпійскага камітэта Георгія Катуліна, а таксама віцэ-прэзідэнта НАК.

Патрык Хікі расказаў, што вялікае ўражанне на прадстаўнікоў Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў зрабіла наведванне спартыўных аб'ектаў у Мінску, у прыватнасці «Мінск-Арэны». «Мы былі ўражаны тым, наколькі добрыя ўмовы створаны для спартсменаў, выдатным архітэктурным рашэннем, цудоўным аздабленнем гэтых збудаванняў», — сказаў прэзідэнт ЕАК.

Паводле яго ацэнкі, шмат што робіцца ў Беларусі для спартыўнай падрыхтоўкі дзяцей і моладзі. У гэтым замежныя госці пераканаліся пасля наведвання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры.

Патрык Хікі выказаў меркаванне, што Беларусь уносіць вялікі ўклад у міжнародны алімпійскі рух, за што ён выказаў асаблівыя словы ўдзячнасці ў адрас Аляксандра Лукашэнкі.

Высокі замежны госць таксама падзякаваў Прэзідэнту за запрашэнне правесці ў Беларусі Еўрапейскія гульні. Цяпер абмяркоўваецца мэтазгоднасць арганізацыі ў 2015 годзе такога спартыўнага форуму, які ініцыяваны Еўрапейскімі алімпійскімі камітэтамі. Як лічыць Патрык Хікі, з улікам высокага ўзроўню створанай спартыўнай інфраструктуры Беларусь цалкам магла б прыняць у сябе спаборніцтва такога ўзроўню.

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым заўважыў, што ў Беларусі сапраўды надаецца вялікае значэнне развіццю спорту. «Спартсмены іншы раз — гэта добрае Міністэрства замежных спраў, а часам і крыху вышэй», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Калі беларускія спартсмены стаяць на п'едэстале і атрымліваюць медалі — гэта заўсёды вялікі плюс для іміджу краіны.

Удзельнікі пасяджэння выканкама Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў падтрымалі меркаванне, што ў Беларусі створаны выдатныя ўмовы для дастойнай падрыхтоўкі спартсменаў, якія заваёўваюць шматлікія ўзнагароды на прэстыжных міжнародных турнірах.

Віцэ-прэзідэнт ЕАК, ганаровы віцэ-прэзідэнт Алімпійскага камітэта Расіі Аляксандр Казлоўскі падзякаваў кіраўніцтву Беларусі за ўклад у развіццё міжнароднага алімпійскага руху і за прапанову правесці ў Беларусі міжнародны форум па пытаннях узаемадзеяння і сумеснай работы ўрадаў і нацыянальных камітэтаў.

У сваю чаргу член выканкама МАК, генеральны сакратар АНАК, генсакратар НАК Швецыі Гуніла Ліндберг высока ацаніла ролю Беларусі ў падрыхтоўцы да маючай адбыцца ў наступным годзе ў Маскве Генеральнай асамблеі Асацыяцыі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў.

Член выканкама ЕАК, прэзідэнт НАК Вялікабрытаніі лорд Колін Мойніхан сказаў у адрас беларускага боку добрыя словы за гасціннасць на беларускай зямлі.

Ён падкрэсліў, што ў Лондане чакаюць беларускіх атлетаў на Алімпійскія гульні-2012 і выказаў упэўненасць, што беларуская каманда дастойна выступіць.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што вялікая беларуская дэлегацыя прыме ўдзел у Алімпійскіх гульнях-2012 у сталіцы Вялікабрытаніі.

Па выніках сустрэчы ад імя Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Патрык Хікі ўручыў Аляксандру Лукашэнку памятны сувенір.

ЕАК з'яўляецца некамерцыйнай грамадскай арганізацыяй, якая аб'ядноўвае нацыянальныя алімпійскія камітэты еўрапейскіх краін. Рашэнне аб стварэнні арганізацыі было прынята ў 1974 годзе. Цяпер яна аб'ядноўвае 49 нацыянальных алімпійскіх камітэтаў краін Еўропы.

НАК Беларусі з'яўляецца паўнапраўным членам ЕАК з 1993 года. З таго часу прадстаўнікі Беларусі прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца ЕАК, — генеральных асамблеях, семінарах генеральных сакратароў і шэфаў місіі, тэхнічных семінарах, еўрапейскіх форумах атлетаў, еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх фестывалях. Цяпер два прадстаўнікі НАК Беларусі з'яўляюцца членамі пастаянных камісій ЕАК: алімпійскі чэмпіён Аляксей Грышын і генеральны сакратар Георгій Катулін.

ЕАК высока ацаніў дзейнасць НАК Беларусі па развіцці алімпійскага руху ў краіне і ў Еўропе ў цэлым. У 2008 годзе прэзідэнту НАК Беларусі Аляксандру Лукашэнку была ўручана спецыяльная ўзнагарода ЕАК за значны ўклад у развіццё алімпійскага руху.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# НА ФУТБОЛ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Выступленне футбалістаў барысаўскага БАТЭ ў групавым раўндзе Лігі чэмпіёнаў выклікала вялікі інтарэс гледачоў і вымусіла кіраўніцтва клуба па-новаму глянуць на пытанне распаўсюджвання білетаў на хатнія матчы, якія сяміразовыя чэмпіёны Беларусі будуць праводзіць на мінскім стадыёне «Дынама».**

Учора на Барысаўскім стадыёне і сталічным стадыёне «Дынама» білетныя пакеты паступілі ў агульны продаж. Продаж білетаў на першы хатні паядынак БАТЭ супраць іспанскай «Барселоны» (28 верасня) для ўладальнікаў абанементаў і членаў Клуба балельшчыкаў ФК БАТЭ абмежаваны адным днём — сённяшняй пятніцай. Прычым тыя ўладальнікі абанементаў і члены Клуба балельшчыкаў, якія набудуць два білетныя пакеты, не атрымаюць дадатковай магчымасці купіць білеты асобна на гульню з «Барселонай». Прыкладна з суботы, 24 верасня, паступяць у адкрыты продаж білеты на паядынак БАТЭ — «Барселона», якія застануцца пасля рэалізацыі ў ходзе папярэдніх этапаў.

Па кошце білеты падзелены на тры катэгорыі. На матчы з «Барселонай» і «Міланам»: — 1-я — Br250 тыс., 2-я — Br150 тыс., 3-я — Br70 тыс. На сустрэчу з «Вікторыяй» цана складае адпаведна Br200 тыс., Br100 тыс. і Br50 тыс. Кошт білетных пакетаў такі: 1-й катэгорыі — Br700 тыс., 2-й — Br400 тыс., 3-й — Br190 тыс. Абмежаванне па продажы на аднаго чалавека — 2 білеты (білетныя пакеты).

**БЕЛТА.**

## ПРАМАЯ ІНТЭРНЭТ-ЛІНІЯ ДЛЯ КВАТЭРАЗДАТЧЫКАЎ

**Сёння на сайце Міністэрства па падатках і зборах Беларусі з 11.00 да 12.00 адбудзецца прамая інтэрнэт-лінія з намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Святланай ШАЎЧЭНКАЙ. Размова будзе весціся па пытаннях падаткаабкладання даходаў, што былі атрыманы ўласнікамі ад здачы ў наём (арэнду) жылых і нежылых памяшканняў.**

Свае пытанні неабходна накіроўваць на «Зваротную сувязь» афіцыйнага сайта МПЗ **(http://www.nalog.by) з паметкай «Прамая лінія»**.

## Памерла легендарная разведчыца Надзея Траян

**Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў Цэнтры грамадскіх сувязяў ФСБ Расіі. Яна памерла 7 верасня на 90-м годзе жыцця пасля працяглай хваробы.**

З пачатку Вялікай Айчыннай вайны Надзея Траян знаходзілася на часова акупаванай фашыстамі тэрыторыі, дзе ўступіла ў рады падпольнай арганізацыі Мінскай вобласці. З ліпеня 1942 года была сувязной, разведчыцай, медсястрой партызанскіх атрадаў «Сталінская пяцёрка» і «Бура» ў Мінскай вобласці. Удзельнічала ў аперацыях па ўзрыве мастоў, нападзенні на варожыя абозы, не раз уступала ў бой з карнікамі.



Адной з бліскуча праведзеных аперацый, у якой яна ўдзельнічала, была ліквідацыя гаўляйтара Беларусі рэйхскамісара Вільгельма фон Кубэ, за што яна была ўдастоена звання Героя Савецкага Саюза. Гэты подзвіг падпольшчыцы пакладзены ў аснову вядомага фільма «Гадзіннік спыніўся апоўначы».

Пасля заканчэння вайны Надзея Траян прысвяціла сябе медыцыне. Прафесійную дзейнасць яна паспяхова сумяшчала з грамадскай працай, з'яўляючыся актыўным удзельнікам ветэранскага руху, а таксама ўзначальваючы выканкам Саюза таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР.

За баявыя заслугі Надзея Траян была ўдастоена высокіх дзяржаўных узнагарод, сярод якіх ордэн Леніна, два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэны Айчыннай вайны першай ступені, Чырвонай Зоркі, Дружбы народаў.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

**Аукционы состоятся 22 сентября 2011 года в 11.00, 11.30 и 12.00 по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал.**

Организатором аукционов является РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.

На аукционы выставляются права заключения договора аренды недвижимого имущества:

**1. Отдельные помещения на 4 этаже в капитальном строении (здание АТС 24), общей площадью 521,0 кв.м (33,8; 20,9; 15,5; 36,6; 15,4; 20,5; 15,5; 20,3; 35,2; 23,6; 12,1; 95,2; 176,4) по ул. Турова, 1 в г. Могилеве.** Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 2,0; помещения будут выставлены на аукцион по продаже права заключения договоров аренды тринадцатью лотами.

Лот № 1: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 295 750 рублей, размер задатка – 29 575 рублей.

Лот № 2: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 182 875 рублей, размер задатка 18 285 рублей.

Лот № 3: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 135 625 рублей, размер задатка – 13 560 рублей.

Лот № 4: Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 320 250 рублей, размер задатка составляет 32 025 рублей.

Лот № 5: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 134 750 рублей, размер задатка – 13 475 рублей.

Лот № 6: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 179 375 рублей, размер задатка – 17 938 рублей.

Лот № 7: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 135 625 рублей, размер задатка – 13 563 рубля.

Лот № 8: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 177 625 рублей, размер задатка – 17 763 рубля.

Лот № 9: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 308 000 рублей, размер задатка – 30 800 рублей.

Лот № 10 Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 206 500 рублей, размер задатка – 20 650 рублей.

Лот № 11: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 105 875 рублей, размер задатка – 10 588 рублей.

Лот № 12: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 833 000 рублей, размер задатка – 83 300 рублей.

Лот № 13: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 1 543 500 рублей, размер задатка – 154 350 рублей.

**2. Отдельные помещения на 4 этаже в капитальном строении (четырехэтажное каменное здание АТС с двумя тамбурами), общей площадью 607,9 кв.м (39,4; 9,7; 558,8) по ул. Островского, д. 52 в г. Могилеве.** Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 2,0; помещения будут выставлены на аукцион по продаже права заключения договоров аренды тремя лотами.

Лот № 1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 344 750 рублей, размер задатка – 34 475 рублей.

Лот № 2. Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 84 875 рублей, размер задатка – 8 488 рублей.

Лот № 3 . Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 4 889 500 рублей, размер задатка – 488 950 рублей.

**3. Отдельные помещения на 4 этаже в капитальном строении (здание АТС 23), общей площадью 614,3 кв.м (38,3; 5,0; 559,5; 4,2; 7,3;) по бульвару Юбилейному, д. 21 в г. Могилеве.** Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 2,0. помещения будут выставлены на аукцион по продаже права заключения договоров аренды одним лотом.

Лот № 1: Начальная цена продажи права заключения договора аренды – 5 375 125 рублей, размер задатка – 537 510 рублей.

Документы на участие в аукционе принимаются **с 12.09.2011 года по 21.09.2011 года** в рабочее время (с 8.00 до 17.00) по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные после **22.08.2011 года**, не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком».

*Извещения о проведении первых аукционов были опубликованы в газете «Звязда» за 11 июля 2011 года № 108, 11 мая 2011 года № 85, за 12.08.2011 № 152.*

**Контактные телефоны: (8 0222) 29 21 33, 29 22 13, факс 22 54 58.**


# БОЛЬ, СМУТАК. І НАДЗЕЯ

## Ігракі «Лакаматыва» пайшлі ад нас, але каманда будзе жыць

**Учора на «Мінск-Арэне» прайшоў вечар-рэквіем па хакеістах «Лакаматыва», якія загінулі ў Яраслаўлі. Сярод іх, нагадаем, было і трое беларусаў.**

**Руслан Салей,** якога не патрэбна прадстаўляць дадаткова. 36-гадовы абаронца нацыянальнай зборнай толькі сёлета перабраўся з-за акіяна, дзе правёў больш за 900 матчаў у нацыянальнай хакейнай лізе, больш за шэсць дзясяткаў — у Кубку Стэнлі. Яго апошні клуб НХЛ «Дэтройт Рэд Уінгз» не падоўжыў кантракт з Русланам, і беларус вырашыў выбраць адну з каманд КХЛ, перабраўшыся бліжэй да радзімы. Не сакрэт, што мінскае «Дынама» прапаноўвала Салею кантракт, аднак Руслан выбраў яраслаўскі «Лакаматыў» і марыў з ім выйграць Кубак Гагарына... Руслан шмат пра што марыў, як і любы звычайны чалавек. У інтэрв'ю пасля чэмпіянату свету 2009 года, якраз калі наша краіна атрымала права правядзення чэмпіянату свету-2014, мы спыталі хакеіста, у якой якасці ён бачыць сябе на гэтым чэмпіянаце: гульца, трэнера ці менеджара. «Менеджара, гэта сама менш. Загадваць, што будзе праз пяць гадоў, складана. Спадзяюся, што буду гуляць у хакей, што буду запатрабаваны. Калі будзе магчымасць гуляць на такім жа высокім узроўні, я з задавальненнем прыеду ў зборную у 2014-м», — абяцаў тады Руслан. Яшчэ ў тым інтэрв'ю хакеіст казаў, што галоўная радасць у яго жыцці — гэта дзеці. У Амерыцы ў Салея засталася жонка Бэтэн і трое дзетак, малодшай дачцэ Эйве няма яшчэ і шасці месяцаў.

21-гадовы **Сяргей Астапчук** быў выхаванцам наваполацкай школы хакея, апошнія чатыры гады ён правёў у Яраслаўлі. У міжсезонне нападаючы трэніраваўся ў першай пяцёрцы...

31-гадовы **Мікалай Крываносаў** быў сынам вядомага беларускага хакеіста і трэнера Івана Крываносава. У яраслаўскую каманду ён перайшоў толькі ў гэтым сезоне ў якасці трэнера па фізпадрыхтоўцы...

Прэзідэнт КХЛ Аляксандр Мядзведзеў учора паведаміў, што 18 з 23 клубаў КХЛ выказалі згоду аддаць яраслаўскаму «Лакаматыву» 2-3 сваіх хакеістаў:

— У новага галоўнага трэнера «Лакаматыва» будзе спіс з 40-45 гульцоў, і ён зможа выбраць з іх добрую каманду. Яраслаўскі клуб будзе рэанімiраваны.

У той час віцэ-прэзідэнт КХЛ Уладзімір Шалаеў заявіў, што матчы КХЛ не адновяцца раней аўторка. А губернатар Яраслаўскай вобласці Сяргей Вахрукоў аб'явіў трохдзённую жалобу ў памяць аб ахвярах авіякатастрофы. Мясцовыя ўлады выплацяць родным загінулых па 300 тыс. расійскіх рублёў, а мэрыя Яраслаўля — па 150 тыс. расійскіх рублёў. Авіякампанія, выконваючы свае абавязацельствы, кожнай сям'і выплачвае па 2 млн расійскіх рублёў.

Галоўны трэнер зборнай Беларусі фін Кары Хейкіля, які ўзначальваў «Лакаматыў» у сезоне 2004/2005 і з 2007 па 2010 год заявіў, што страціў у авіякатастрофе пад Яраслаўлем сваіх сяброў:

— Адбылася вельмі, вельмі страшная трагедыя. Я страціў многіх сяброў. Я ведаў літаральна кожнага, хто загінуў у гэтым самалёце. Я ведаю іх сем'і, іх дзяцей. У Яраслаўлі мы сталі вельмі добрымі сябрамі. Я зараз у Мінску, жыву ў той гасцініцы, куды яны павінны былі прыбыць, я чакаў іх напярэдадні. І я не мог паверыць, што такое магчыма, калі пачуў, што адбылася катастрофа. Безумоўна, да канца жыцця я буду памятаць тых, хто заўчасна ад нас пайшоў, і ўсведамляць страту будзе балюча. Але хакей у Яраслаўлі павінен захавацца.

Пазаўчора транспартны самалёт Іл-76, які належыць расійскаму МНС, даставіў у Маскву Аляксандра Галімава і Аляксандра Сізава, якім пашчасціла выжыць падчас крушэння Як-42. Іх суправаджала сем урачоў, а таксама сваякі. Стан абодвух медыкі ацэньваюць як крайне цяжкі.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## САЛЕЙ БУДЗЕ ПАХАВАНЫ Ў МІНСКУ

Галоўны трэнер сталічнай «Юнацтва» Міхаіл Захараў паведаміў РІА «Навіны», што Руслан Салей будзе пахаваны на Усходніх (Маскоўскіх) могілках Мінска. Беларускі хакеіст быў яго выхаванцам. «Руслан будзе пахаваны на Маскоўскіх могілках Мінска ў суботу ці ў нядзелю», — сказаў Захараў. Захараў адзначыў, што Салей быў яго сябрам, і ён гатовы асабіста аказаць любую пасільную дапамогу яго сям'і, а таксама сем'ям двух іншых загінулых ураджэнцаў Беларусі — форварда Сяргея Астапчука і трэнера Мікалая Крываносава.



**Хакейны клуб «Дынама-Мінск» адразу пасля таго, як з'явілася інфармацыя аб трагедыі, вывесіў над уваходам у «Мінск-Арэну», дзе меў адбыцца матч, лагатып яраслаўскага «Лакаматыва». Балельшчыкі ўвесь вечар 7 верасня і на працягу дня 8 верасня прыносілі да будынка кветкі і запальвалі свечкі. Учора замест матча балельшчыкі ўшанавалі памяць загінулых на вечары-рэквіеме. Усе грошы ад білетаў на матч, якія былі прададзены загадзя, хакейны клуб «Дынама-Мінск» вырашыў пералічыць «Лакаматыву».**





Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.


ПОСОЛЬСТВО БРАЗИЛИИ – НА СТАДИИ ОТКРЫТИЯ –

**ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР НА ДОЛЖНОСТИ АДМИНИСТРАТИВНОГО ПЕРСОНАЛА**

**(для осуществления анализа в сфере политики и экономики, административной, бухгалтерской и секретарской работы).**

СРОК ПОДАЧИ ЗАЯВОК – до 20 сентября 2011 г.

Резюме (на португальском или английском или испанском языках) просим высылать на электронную почту **brasemb.minsk@itamaraty.gov.br,** где также можно запросить список необходимых документов и требований к кандидатам.


## ДАБРАЧЫННЫ РАХУНАК

**Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь адкрыла спецыяльны дабрачынны рахунак для збору ахвяраванняў у адрас сем'яў членаў каманды яраслаўскага «Лакаматыва», загінулых у авіякатастрофе 7 верасня, паведамілі БЕЛТА ў прэсслужбе ФХРБ.**

**Рэквізіты дабрачыннага рахунку:**
**«Пріорбанк» ААТ, ЦБУ 113**
**г. Мінск, БІК 15300749**
**УНП 100369599**
**Рахунак у доларах, еўра, расійскіх рублях:**
**№ 3135006793528**
**Рахунак у беларускіх рублях:**
**№ 3135006793010.**

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.09.2011 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 5 232,00 | 1 чэшская крона | 301,04 |
| ▲ 1 еўра | 7 358,28 | 1 польскі злоты | 1 745,11 |
| 1 латвійскі лат | 10 381,98 | ▲ 1 расійскі рубель | 177,35 |
| 1 літоўскі літ | 2 132,20 | 1 украінская грыўня | 655,02 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,5015 |
| 10 UAH | 36,8838 |
| 10000 BYR | 56,5163 |
| EUR | 41,5175 |

# ПАНЯДЗЕЛАК, 12 ВЕРАСНЯ

### ПЕРШЫ

**6.00, 7.10, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05, 18.50** «Зона Х».
**7.30, 8.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**8.30** Час кіно.
**9.10, 19.55 Серыял «Маргоша».**
**10.05, 17.05 Серыял «Заклад».**
**11.00, 18.00 Серыял «Пацалунак Сакрата».**
**12.10 Меладрама «Трамвай у Парыж».**
**14.05** Здароўе.
**14.35** Дак. фільм «Лаўрышава».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35 Баявік «Таксі-3».**
**19.30** Арэна.
**21.00** Панарама.
**21.45** Камандзіроўка.
**22.00 Баявік «Крутыя часы».**
**0.15** Дзень спорту.
**0.25** «У пошуках ісціны».

### АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00** (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
**6.10** «Наша раніца».
**9.10** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Дараваць».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 «Страчаны свет». Серыял.**
**12.00, 0.10 «Таварышы паліцэйскія». Серыял.**
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.40** «Кантрольная закупка».
**14.10** «Модны прыгавор».
**15.10 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.**
**16.15** «Дэтэктывы».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Беларускія сядзібы. Узарваны свет».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Адкрыты фармат».
**22.10 «Атлантыда». Серыял.**
**23.10** «Сведкі».
**1.05** Начныя навіны.

### ЛАД

**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00, 21.15** Тэлебарометр.
**8.05, 21.25 Серыял «Ты маё жыццё».**
**9.00, 19.00 Серыял «Інтэрны».**
**10.05** Жансавет.
**10.40, 21.30** Канцэрт «The Eagles. Farewell I Tour».
**12.30 Камедыя «Карасі».**
**14.25** Навіны надвор'я.
**14.55** Гадзіна суда.
**16.00** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**16.35** Урачэбныя тайны+.
**16.50 Баявік «Крапавы берэт». 1-я серыя.**
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) — Авангард (Омск).
**21.20** КЕНО.
**0.10** Авертайм.
**0.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.35** «Вялікае снеданне».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40 Серыял «Нашы суседзі».**
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35, 18.30 Серыял «Агонь кахання».**
**13.50** «Зорны рынг».
**14.55** «Вялікі горад».
**15.20** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.00** «Я — падарожнік».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.25 Маст. фільм «На кручку!».**
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Тайны свету з Ганнай Чапман».

### МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**5.05** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**5.20, 15.25** «Дом з гісторыяй».
**6.05** «Цік-так».
**6.20** М/с «Папялушка».
**7.05, 4.00 Серыял «Рускія амазонкі».**
**8.05, 22.05** «Жывая гісторыя».
**9.05** «Разам».
**10.05 Серыял «Багатая і каханая».**
**11.05 Маст. фільм «Джэк Васьмёркін — «амерыканец».**
**13.05** М/с «Прыгоды майстра Кун-Фу».
**13.30 Серыял «Старшакласнікі».**
**14.05 Серыял «Ёхан ды Мар'я».**
**14.35** «Помню блакаду».
**16.05, 17.05 Серыял «Агонь кахання».**
**18.25** «Акцэнты».
**18.40, 2.00** «Саюзнікі».
**19.00, 2.30 Серыял «Мужчыны не плачуць».**
**19.50, 1.05** «Слова за слова».
**21.20, 3.30** «Свет спорту».
**23.05, 0.05 Серыял «Прыватны дэтэктыў».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 10.05, 14.10, 18.55, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**7.20 Камедыя «Паслушніцы».**
**8.50** Рэзерв.
**9.00, 18.00 Серыял «Зачараваныя».**
**9.45** «К-відэа» для дзяцей».
**10.10 Трылер «Пастка».**
**11.00 Драма «Шукальнікі прыгод».**
**12.00** «Кінаблакнот».
**12.20 Серыял «Каломба».**
**14.15 Серыял «Рэмінгтан Сціл».**
**16.00** Мультпарад.
**16.25** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Тэс з роду Дэрбервіляў».**
**19.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Полымя страсці».**
**23.00 Серыял «Байкі са склепа».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 20.00 Серыял «Варонiны».**
**10.00, 21.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**11.00** «Гэта маё дзіця».
**12.00, 17.00** «Хачу верыць».
**13.00 Серыял «Як сказаў Джым».**
**14.00 Серыял «Галыгін.ru».**
**15.00 Серыял «Ранеткі».**
**16.00** «Свет у тваёй талерцы».
**19.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**22.00 Серыял «Аманда О».**
**0.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**12.25** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**12.55** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.10** Навіны—Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоу.
**16.20 «Кулагін і партнёры».**
**17.35** Весткі. Дзяжурная часць.
**17.50 Серыял «Сёстры па крыві».**
**18.50 Серыял «Ефрасіння. Працяг».**
**20.30** «Прамы эфір».
**21.30 Серыял «Каменская-6».**
**23.20 Серыял «Ненармальная».**
**0.20** «Захад ёсць Захад. Усход ёсць Усход. Усевалад Аўчыннікаў». Фільм 1-ы.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «НТБ раніцай».
**8.35** «Праграма «Максімум».
**9.35, 15.35, 18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25 Серыял «Пятля».**
**15.10** «Справа густу».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.35 Серыял «Марскія д'яблы».**
**21.25 Серыял «Глухар. Вяртанне».**
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**0.30 Серыял «Алібі» на дваіх».**

### ТНТ

**5.00** «Невытлумачальна, але факт».
**6.00** М/с «Бэтмэн: адважны і смелы».
**6.25, 9.40** «Нікеладэон на ТНТ».
**7.30, 17.30, 19.30 «Універ».**
**8.30, 18.00 «Зайцаў + 1».**
**9.00, 12.25, 18.30 «Шчаслівыя разам».**
**11.05 М/с «Скубі-Ду і Шэгі ключ знойдуць!».**
**12.00** М/с «Пінгвіны з «Мадагаскара».
**13.30, 22.00, 23.00, 3.15** «Дом-2».
**15.15 «Хлопчык у дзяўчынцы». Камедыя.**
**17.00, 19.00 «Інтэрны».**
**14.55 «Крок наперад 3D». Меладрама.**
**20.00 Камедыя «Прывіды былых сябровак».**
**23.30** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**0.00 «Як баязлівы Роберт Форд забіў Джэсі Джэймса». Драма.**
**4.15** «Камедыянты».
**4.25 «Саша+Маша».**

### ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** З новай раніцай.
**9.10, 16.20, 23.30 Серыял «Белы ікол», 1-я серыя.**
**9.35, 16.45, 23.55 Серыял «Так мала часу», 1-, 2-я серыі.**
**10.20, 17.30, 5.15** Дак. серыял «Rolling Stones. Проста для запісу», 1-я серыя.
**11.15, 20.35 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**12.15** Знак якасці.
**12.45, 19.10, 2.10 Серыял «Праверка на каханне».**
**13.35, 0.40** Сямейны суд.
**14.15 Маст. фільм «За кім замужам спявачка?».**
**15.35, 6.05** Пазаночы. Рыгор Лепс.
**18.25, 1.25** Ток-шоу «Усе свае».
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
**20.30, 3.30** Спорт у Падрабязнасцях..
**21.20, 3.35 Серыял «Сваты-3».**
**22.10, 4.25 Серыял «Партнёры», 1-я серыя.**
**23.00** Агенты ўплыву.

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.40, 18.30, 22.40** Навіны культуры.
**9.20 Маст. фільм «Папа, папа, бедный папа, ты не вылезешь из шкапа, ты повешен нашей мамой между платьем и пижамой».**
**10.45** Дак. фільм «Іаган Кеплер».
**10.55** «Ля вытокаў».
**11.40** «Аляксандр Свірскі. Абаронца і апякун».
**12.20** Дак. серыял «Гісторыя твораў мастацтва».
**12.50** «Лінія жыцця».
**13.45** «Нямая сцэна».
**14.50** «Грязеземье». М/с.
**15.10 Серыял «Уладар маланкі».**
**15.35** Дак. серыял «Экасістэмы. Павуцінне жыцця».
**16.00** Кніга года-2011.
**16.40** Вялікія кампазітары эпохі барока.
**17.40** Прыступкі цывілізацыі.
**18.45** Галоўная роля.
**19.05** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.45, 0.45** Academia.
**20.30 Серыял «Раскол».**
**22.10** «Часы не выбіраюць».
**23.05** Дакументальная камера.
**23.45** «Ліон. Прыгажосць, якая вісіць на шаўковым шнуры».
**0.05** «Гідон Крэмер і сябры».
**1.30** Дак. серыял «Гісторыя твораў мастацтва».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Да і пасля...». Год 1984.
**6.10** «Песня-84».
**7.10** Дак. фільм «Настальгія па Ташкенце». 2011 год.
**8.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00 «Тэатр». Маст. фільм.**
**10.10, 16.10** Канцэрт Л. Доліная. 1993 год.
**11.00** «Аншлаг? Аншлаг!». 1992 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Ранішняя зорка». 1992 год.
**14.00** «Быў час».
**17.00 «Новыя прыгоды Доні і Мікі». Маст. фільм.**
**17.30** «Гэта вы можаце». 1993 год.
**18.15** «Спявае Кола Бельды». 1977 год.
**18.40** «Вішнёвы сад». Спектакль. 1976 год.
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Музычны рынг». 1989 год.
**23.00** «Сустрэчы з майстрамі тэатра». 1969 год.
**0.10** «Мелодыі, якія пражылі стагоддзі». 1981 год.
**0.40 «Чароўная сіла мастацтва». Маст. фільм.**
**4.00** «Кінапанарама». 1990 год.

### MTV

**5.00, 2.00** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**8.10** Руская дзясятка.
**9.10** News блок Weekly.
**9.40, 12.30, 16.30, 18.00, 1.00** Вольны.
**10.10** У пагоні за прынцам.
**11.00** У гасцях у продкаў.
**11.25, 16.05** Наступны.
**11.50** Зоркі на далоні.
**12.20, 22.50** News блок.
**13.00, 18.30** Індустрыя моды.
**13.10, 18.40** «Подыум».
**14.00, 0.10 «90210: новае пакаленне». Серыял.**
**14.50** Кахаць або забіць.
**15.15** Спатканне на выжыванне.
**15.40** Шалёныя продкі.
**17.00, 21.00** Канікулы ў Мексіцы.
**20.00** News блок XXL.
**22.00 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.**
**23.00** «Ноч на віле».
**23.15** Трэндзі.
**23.40 «Малакасосы». Серыял.**
**1.30** Зоркі на далоні.

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Камедыя «Мядовы месяц».
**8.05, 14.05** Меладрама «Харыстка».
**8.30, 14.30** Дэтэктыў «Калье Шарлоты».
**11.55, 17.55** Драма «Сваякі».
**18.30, 0.30** Меладрама «Дочкі-маці».
**20.30, 2.30** Драма «...А золкі тут ціхія».
**23.35, 5.35** Фільм-канцэрт «Паўлаўск».

### ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку».
**3.45** Меладрама «Альпініст».
**5.15** Камедыя «Максім Перапяліца».
**6.45** Драма «Вяртанне да жыцця».
**9.25** Камедыя «Прыгонная актрыса».
**11.45** Камедыя «Суддзя ў пастцы».
**13.30** Прыгоды «Гонка стагоддзя».
**15.00** Камедыя «Масква слязам не верыць».
**17.25** Меладрама «Дом для дваіх».
**19.40** Меладрама «Квартантка».
**21.15** Камедыя «Цудоўны характар».
**22.45** Драма «Змеялоў».
**0.15** Містыка «Алеся».
**1.40** Трагікамедыя «Невераготны заклад, або Сапраўднае здарэнне, якое добра скончылася сто гадоў таму».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Фільм-казка «Салавей».
**6.25, 10.25, 14.25** М/с «Дзякуй, доктар!». М/ф: «У гасцях у гномаў», «Казка пра белую льдзінку».
**7.00, 11.00** Казкі Андэрсена. «Дзікія лебедзі».
**8.00, 12.00** М/ф: «Тры таўстуны», «Чацвёра з аднаго двара», «Жывая цацка».
**15.00** Камедыя «Фантазёры».
**16.05** М/с «Прыгоды капітана Врунгеля». М/ф: «Мышаня Пік», «Чаму знікла шапка-невідзімка».
**17.00** М/с «Фархат — прынц Персіі». М/ф: «Дзень нароДзінаў». «Вясёлая карусель» № 22.
**18.00** «Урокі цётачкі Савы». М/ф: «Кім быць?», «Да пабачэння, яр».

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00** Серыял «Літоўскі транзіт».
**20.00, 2.00** Серыял «Абарона Красіна-2».
**21.00, 3.00** Серыял «Сышчыкі».
**22.00, 23.30** Серыял «Атрад спецыяльнага назначэння».
**1.00** Серыял «Час жорсткіх». 1-я серыя.

### ТБ3

**5.00** М/ф.
**5.30** Серыял «Трэцяя планета ад Сонца».
**6.00** Серыял «Зена — каралева воінаў». 1-я серыя.
**7.00, 14.00** Серыял «Робін Гуд».
**8.00** Дак. фільм «Страчаныя светы».
**9.00** Маст. фільм «Апошняя справа Ламаркі».
**11.00** Серыял «Ангар 13».
**12.00** «Далёка і яшчэ далей».
**13.00** Дак. фільм «Вайна пол аў».
**15.00** «Як гэта зроблена».
**15.30** Дак. фільм «Кахае — не кахае».
**16.00** Дак. фільм «Праўда пра НЛА».
**17.00** Серыял «Заўтра пачнецца сёння».
**18.00** Серыял «Косці».
**19.00** Дак. фільм «Лялькі ведзьмака». 1-я серыя.
**20.00** Серыял «Торчвуд: дзеці зямлі-3».
**22.00** Маст. фільм «Вар'яты».
**0.00** Покер дуэль.
**1.00** Маст. фільм «Цунамі».
**3.00** Серыял «Застацца ў жывых».
**4.00** Дак. фільм «Сярэбраны кубак. Праклящце старажытнага роду».

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Серыял «Гоя».
**10.05, 18.05, 2.05** Меладрама «Удалечыні ад яе».
**12.00, 20.00, 2.00** Фантастыка «Мебіус».
**13.35, 21.35, 5.35** Камедыя «Кантракт на каханне».
**15.20, 23.20, 7.20** Драма «Брытагаловыя».

### ТБ1000

**3.00, 21.00** Баявік «Смяротная зброя».
**5.00** Меладрама «Палюбоўнікі».
**7.00** Камедыя «Кожны Божы дзень».
**8.50** Прыгоды «Доля жанчыны».
**11.00** Баявік «Адзінаццаць сяброў Оўшэна».
**13.00** Маст. фільм «Хаціко: самы верны сябар».
**15.00** Камедыя «Праўда і нічога акрамя...».
**16.40** Драма «Заснежаныя кедры».
**19.00** Драма «Джындабайн».
**23.20** Драма «Здраднік».
**1.20** Драма «Проста разам».

### DIVA UNIVERSAL

**5.00** «Джордан расследуе».
**6.40, 13.20, 18.20** «Дамы сям'і Гілмор».
**7.30, 11.40, 19.10** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Ёрка».
**8.20** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Джэрсі».
**9.10** «Нявеста для мільянера».
**10.05** Маст. фільм «Смяротная лінія».
**12.30, 17.30** «Быць Эрыкай».
**14.10** Драма «Шчаслівая сямёрка».
**15.50** Копы-навабранцы.
**21.40** Камедыя «Злачынствы моды».
**23.05** Драма «Цана прыгажосці».
**0.30** «Сэкс у вялікім Парыжы».
**2.10** Трылер «Кола падману».
**3.40** Драма «Жаночыя штучкі».

### РАМАНТЫКА

**7.00, 21.20, 5.20** «Тайна Лауры».
**7.55, 10.40, 20.30** «Доля-ліхадзейка».
**8.50, 14.10, 16.55, 0.55** «Дзеля кахання Глорыі».
**9.45, 15.05, 3.35** «Мая Папялушка».
**11.30, 17.45, 2.40** «Паслухай, красуня».
**12.25, 1.50, 6.10** «Плата не па заслугах».
**13.20, 23.05, 4.30** «Парадоксы кахання».
**16.00, 19.35, 22.10** «Амазонія».
**0.00** «Жанчыны».

### AXN-SciFi

**0.30** Вузы крыві.
**1.15, 10.15** Фактар страху.
**1.55, 3.50, 11.00, 16.20** Чорная лагуна.
**3.05, 6.25, 12.15** Зорны дэсант.
**5.00, 13.00** Зорны шлях.
**5.45, 13.45, 17.45** На краі Сусвету.
**7.15** Зорны крэйсер Галактыка.
**9.30** Чалавек-невідзімка.
**14.35** Паляўнічыя на прывідаў.
**15.00** Страшна цікава.
**15.25, 21.40** Дзённікі вампіра.
**16.10, 23.55** Прыцемкі ў Вальмонце.
**18.30** Мёртвая зона.
**19.15, 22.25** Звышнатуральнае.
**20.00** Візіцёры.
**23.10** Гарады падзямелля.

### EUROSPORT

**9.30** Мотаспартыўны часопіс.
**9.45** «Прыгоды. Ultra Trail. Мон-Блан».
**10.15, 15.30, 23.30** Снукер. Мастэрс. Фінал.
**11.00, 16.30, 20.00** Тэніс. US Open. Мужчыны. Фінал.
**12.15** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
**13.15** Веласпорт. Гран-пры.
**18.00** Тэніс. «Матс поінт».
**18.30, 1.00** Футбол. Еўрагалы.
**19.30, 2.00** Футбол. «Гульня на выбыванне».
**21.45** Вось гэта дзіва!!!
**22.00** Пра рэстлінг.

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 17.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** Каралева тыграў.
**7.00, 12.00** «11 верасня і амерыканская мара».
**9.00** Дзікая прырода Расіі.
**10.00, 16.00** Ліхтугі за мяжой.
**11.00, 19.00, 4.00** Суперзбудаванні.
**14.00** Драпежнікі неба.
**15.00** Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
**18.00, 1.00** Погляд знутры.
**20.00, 23.00, 2.00** Зусім сакрэтна.
**21.00, 0.00, 3.00** Турэмныя цяжкасці.
**22.00** Забароны.

### DISCOVERY

**7.00** «Пятая передача».
**7.25** Праект «Зямля».
**8.20, 19.00, 5.10** «Як гэта зроблена?».
**8.50, 19.30, 5.40** «З чаго гэта зроблена?».
**9.15, 0.00** «Круцей не прыдумаеш».
**10.10, 18.00, 3.50** Разбуральнікі легендаў.
**11.05** «Браты па зброі».
**12.00, 2.55** Заводскія будні.
**12.55** Навуковая нефантастыка.
**13.50** Як уладкаваны Сусвет.
**14.45, 20.00, 1.00** «Top Gear».
**15.40, 6.05** Лепшыя аўтамабілі.
**16.35** Дэмантаж.
**17.05** Залатая ліхаманка.
**21.00, 2.00** Выжыць любой цаной.
**22.00** Выжыць удваіх.
**23.00** «Смяротны ўлоў».
**4.45** Маланкавыя катастрофы.

### TRAVEL

**7.00, 9.00, 12.00, 16.00, 19.00, 23.00, 4.00** Сусветны падарожнік.
**8.00, 14.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**10.00, 0.00, 5.00** Планета ежы.
**11.00** Падарожжа за марай.
**13.00, 18.00** Смак.
**15.00** Падарожжа сёння.
**15.30, 21.00, 2.00** Круіз сёння.
**17.00, 6.00** Далёкія берагі.
**20.00, 1.00** Пра галоўнае...
**21.30, 22.30** Культурны шок.
**22.00, 3.00** Мараплаўцы.

### ANIMAL PLANET

**7.00** Маёнтак сурыкатаў.
**7.25, 16.00** «Самае дзікае шоу».
**7.50** Планета малых.
**8.40, 18.20** Усё пра сабак.
**9.10, 6.10** Праект «Шчанюкі».
**10.05, 4.25** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**11.00, 5.20** Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
**11.55** Ветэрынары-стажоры.
**12.20** «SOS дзікай прыроды».
**12.50** Сабакі ў турме.
**13.45, 18.45** Паляўнічы на кракадзілаў.
**14.40** Акуле ў зубы.
**15.30** Рай для шымпанзэ.
**16.30** «Разбуральнікі стэрэатыпаў».
**16.55** Сямейнае сафары.
**17.25** Сабакі, коткі і іншыя любімцы.
**19.40** «Царства гепардаў».
**20.10** Перакладчык з сабачай.
**21.05, 1.40** Як пераежыць напад акул.
**22.00, 2.35** Самыя небяспечныя ў акіяне.
**22.55, 3.30** «Я жывы».
**23.50** «Сапраўдны страчаны свет».
**0.45** Дзікія і небяспечныя.

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Генезіс здароўя.
**5.50, 20.50** Цела чалавека.
**6.30, 21.30** Колькі вам гадоў?
**7.10, 22.10** Дыялогі пра харчаванне.
**8.00, 23.00** Выдаткі вытворчасці.
**8.40, 12.50, 23.40, 3.50** Гэта карысна ведаць!
**9.50, 0.50** Алкаголь, тытунь, наркотыкі.
**10.30, 1.30** Панацэя.
**11.00, 2.00** Жаночы часопіс.
**11.40, 2.40** Я перамог гэты боль.
**12.10, 3.10** Кабінет прыгажосці.
**13.45, 15.45, 4.45** Азбука здароўя.
**14.00** Дзіцячы ўрач.
**14.40** Будзем здаровыя.
**15.20** Шлях да здароўя.
**15.50** Найноўшыя дасягненні.
**16.30** Нетрадыцыйная медыцына.
**17.00** Пачуцці чалавека.
**17.40** Элемент здароўя.
**18.20** Я расту.
**18.40** Энцыклапедыя памылак.
**18.50** Спорт для дзяцей.
**19.30** Алергія.

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.00, 16.55, 17.50, 18.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 23.45, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.30, 2.00** Нашы дзеці.
**14.30, 1.00** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 0.05** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.

### 20.25 ФІЛЬМ ДНЯ

**«НА КРУЧКУ!»** (РАСІЯ, 2011 г.)

Трэнер дзіцячай школы Рыта пакрыўджаная няверным каханым. Той пакінуў яе, каб ажаніцца з сястрой нейкага Уласава, які займае 13-е месца ў спісе самых багатых людзей краіны. Каб адпомсціць былому жаніху, Рыта вырашае ўлюбіць у сябе гэтага самага Уласава. Ёсць толькі адна «невялікая» праблема: ніхто не ведае, як выглядае загадкавы Уласаў.



**Рэжысёр** — Наталля Угліцкіх. **У ролях:** Кацярына Вілкова, Канстанцін Крукаў, Марат Башараў, Максім Мацвееў.

# АЎТОРАК, 13 ВЕРАСНЯ

### ПЕРШЫ

**6.00, 7.10, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05, 18.50** «Зона Х».
**7.30, 8.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.35** Арэна.
**9.10, 19.55 Серыял «Маргоша».**
**10.05, 17.00 Серыял «Заклад».**
**11.00, 17.55 Серыял «Пацалунак Сакрата».**
**12.10 Меладрама «Ніколі не забуду цябе!».**
**13.55** Ток-шоу «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** М/с «Гара Самацветаў».
**16.00** «Эпоха».
**19.30** «Сфера інтарэсаў».
**21.00** «Панарама».
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Вікторыя — БАТЭ.
**23.50** Дзень спорту.
**0.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.

### АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00** (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
**6.10** «Наша раніца».
**9.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Дараваць».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 «Страчаны свет». Серыял.**
**12.00, 0.00 «Таварышы паліцэйскія». Серыял.**
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольная закупка».
**14.10** «Модны прыгавор».
**15.10 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.**
**16.15** «Дэтэктывы».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20 «Каралева экрана». Серыял.**
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Трохі не ў сабе».**
**22.10 «Атлантыда». Серыял.**
**23.10** «На ноч гледзячы».
**0.55** Начныя навіны.

### ЛАД

**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00, 21.15** Тэлебарометр.
**8.05, 18.00 Серыял «Ты маё жыццё».**
**9.00, 19.00 Серыял «Інтэрны».**
**10.05** Жансавет.
**10.40, 21.25** Канцэрт Depesh Mode.
**12.30** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**13.15** Авертайм.
**13.45 Фільм — дзецям «Палёт у краіну пачвар».**
**14.55** Гадзіна суда.
**16.00** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**16.40** Урачэбныя тайны+.
**16.50 Баявік «Крапавы берэт».**
**20.00** «Беларуская часінка».
**21.00** Калыханка.
**21.20** КЕНО.
**23.10** Спорт-кадр.
**23.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Чэлсі — Баер.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «На кручку!».**
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40 Серыял «Нашы суседзі».**
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35, 18.30 Серыял «Агонь кахання».**
**13.50 Камедыя «На спіне ў чорнага ката».**
**15.25** «Ваенная тайна».
**16.50** «Сталічны футбол».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.25 Маст. фільм «Жан-Клод Вам Дам».**
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20 Серыял «Забойная сіла 6».**
**0.15 Серыял «Жорсткі бізнэс».**

### МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**5.05** «Садружнасць LIVE».
**5.20, 15.25** «Дыялог з усім светам».
**6.05** «Цік-так».
**6.20** М/с «Папялушка».
**7.05, 4.00 Серыял «Рускія амазонкі».**
**8.05, 22.05** «Жывая гісторыя».
**9.05** «Агульны рынак».
**9.25** «Агульны інтарэс».
**10.05 Серыял «Багатая і каханая».**
**11.05 Маст. фільм «Джэк Васьмёркін — «амерыканец».**
**13.05** М/с «Прыгоды майстра Кун-Фу».
**13.30 Серыял «Старшакласнікі».**
**14.05 Серыял «Ёхан ды Мар'я».**
**16.05, 17.05 Серыял «Агонь кахання».**
**18.25** «Акцэнты».
**18.40, 2.00** «Усходы жыццё».
**19.00, 2.30 Серыял «Мужчыны не плачуць».**
**19.50, 1.05** «Слова за слова».
**21.20, 3.30** «Зямля і людзі».
**23.05, 0.05 Серыял «Прыватны дэтэктыў».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.10, 14.00, 18.55, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 14.05 Серыял «Сапраўднае каханне».**
**8.45, 15.40** «Кінаблакнот».
**9.05, 18.00 Серыял «Зачараваныя».**
**10.00, 16.00** Мультпарад.
**10.30, 19.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**12.15 Меладрама «Полымя страсці».**
**16.25** «К-гульні — «Лайт».
**16.30** «Бульбокс».
**17.00 Серыял «Тэс з роду Дэрбервіляў».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Дэтэктыў «Права на забойства».**
**22.55 Серыял «Байкі са склепа».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 20.00 Серыял «Варонiны».**
**10.00, 21.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**11.00, 22.00 Серыял «Аманда О».**
**12.00, 17.00** «Хачу верыць».
**13.00 Серыял «Як сказаў Джым».**
**14.00 Серыял «Галыгін.ru».**
**15.00 Серыял «Ранеткі».**
**16.00, 0.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**19.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.05 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 16.20 «Кулагін і партнёры».**
**12.00, 21.30 Серыял «Каменская-6».**
**13.50, 16.50, 19.50, 0.10** Навіны—Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.25** «З новым домам!». Ток-шоу.
